## Юрий Леонидович КАЗАКОВ

## Юрый Леанідавіч КАЗАКОЎ

## Jury Leanidavich KAZAKOU



Юбілейныя даты – добрая нагода выказаць шаноўнаму калегу шчырыя, цёплыя словы ўдзячнасці і павагі, на якія ў штодзённых клопатах не заўжды хапае часу. У ліпені адзначыў слаўны сямідзясяты дзень нараджэння навуковец, таленавіты выкладчык і выдатны арганізатар адукацыйнага працэсу, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Юрый Леанідавіч Казакоў.

Уся дзейнасць Юрыя Леанідавіча непарыўна звязана з Беларускім дзяржаўным універсітэтам. Тут ён атрымаў вышэйшую адукацыю, далучыўся да навуковай працы і паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю, тут сталеў як выкладчык, праявіў сябе як выдатны арганізатар і кіраўнік, набыў сяброў. Ва ўніверсітэце сустрэўся з будучай жонкай – таленавітым філолагам Таццянай Пятроўнай Казаковай, якая пазней стала загадчыкам кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта. З БДУ звязаў свой лёс і сын навукоўцаў Леанід Юр'евіч, які працуе на гістарычным факультэце.

Нарадзіўся Юрый Леанідавіч Казакоў 27 ліпеня 1950 г. у сям'і служачых у г. п. Шуміліна Сіроцінскага (цяпер – Шумілінскага) раёна Віцебскай вобласці. Заўжды з пяшчотай і цеплынёй навуковец узгадвае хараство і прыгажосць малой радзімы, сваё дзяцінства. Маці, Алімпіяда Іванаўна, працавала сакратаром гарадскога пасялковага савета, а потым бухгалтарам. Бацька, Леанід Пятровіч, быў вылучаны на кіруючую партыйную пасаду, у сувязі

CC BY NC

з чым сям'я мусіла часта пераязджаць. Так, у 1952 г. яны жылі ў г. п. Езярышча. Там у 1957 г. Юрый Казакоў пайшоў у школу. Але ўжо ў 1958 г. бацьку зноў перавялі ў іншае месца – г. Невель Пскоўскай вобласці. За бацькам пераехала ўся сям'я. Хлопчык працягнуў вучобу ў невельскай школе № 1. У 1959 г. ён лёгка паступіў у музычную школу, якую паспяхова скончыў праз пяць гадоў. Цяжкае выпрабаванне прыйшло ў 1964 г. – не стала бацькі. Сям'я адправілася ў Мінск. Дазвол на пераезд і прапіску ў сталіцы рэспублікі «членам сям'і былога партызанскага камісара» даў непасрэдна Пётр Міронавіч Машэраў. Маці хутка ўладкавалася ў БДУ, дзе плённа працавала яшчэ шмат гадоў старшым бухгалтарам, а потым намеснікам галоўнага бухгалтара.

У Мінску Юрый Казакоў працягнуў вучобу ў школе № 2, дзе і скончыў дзясяты клас у 1967 г. Пераезды, сямейныя нягоды адмоўным чынам паўплывалі на вучобу: у атэстаце пераважалі ацэнкі «добра» і «пасрэдна», але ў характарыстыцы за выпускны клас адзначаліся добрыя здольнасці хлопца да вучобы і працавітасць. Гэтыя якасці і высокія балы ў школьным атэстаце па геаграфіі, беларускай літаратуры і гісторыі СССР прадвызначылі гуманітарны профіль прафесіі будучага навукоўца.

У 1967 г. Юрый Леанідавіч падаў дакументы на паступленне на гістарычны факультэт БДУ. Упартая падрыхтоўка дала добрыя вынікі: на ўступных экзаменах абітурыент атрымаў выдатныя адзнакі за сачыненне па рускай мове, прысвечанае першай настаўніцы, і вусны экзамен па рускай мове і літаратуры, а па гісторыі СССР – ад самога Пятра Захаравіча Савачкіна, дэкана факультэта, – ацэнку «добра». Ужо 25 жніўня 1967 г. Ю. Л. Казакоў быў залічаны на гістарычны факультэт БДУ. Пачалося вірлівае студэнцкае жыццё.

Юрыю Леанідавічу пашчасціла слухаць лекцыі славутых карыфеяў гістарычнага факультэта: Генадзь Іосіфавіч Даўгяла распавядаў пра загадкавы Старажытны Усход, асновы этнаграфіі чытаў Міхаіл Фёдаравіч Піліпенка, гісторыю Беларусі – Лаўрэнцій Сямёнавіч Абэцэдарскі, гісторыю Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма выкладаў Фёдар Макар'евіч Нячай, які, дарэчы, стаў навуковым кіраўніком першай курсавой работы Ю. Л. Казакова. У заліковай кніжцы студэнта адлюстравалася амаль уся гісторыя факультэта ў яе знакавых постацях (П. З. Савачкін, І. В. Царук, Д. Б. Мельцер, М. Г. Елісееў, В. Н. Рабцэвіч, Л. А. Міхайлоўскі і інш.). Юрыю Леанідавічу давялося праходзіць археалагічную практыку пад кіраўніцтвам Эдуарда Міхайлавіча Загарульскага, пісаць курсавыя работы ў Іраіды Восіпаўны Царук, слухаць спецкурсы Міхаіла Яфімавіча Шкляра. Цяжкавата давалася студэнту замежная мова: пасля школьнага курса французскай прыйшлося засвойваць іспанскую мову, якую выкладала Я. А. Фернандэс-Флорэс. Але вучыўся Ю. Л. Казакоў толькі на добра і выдатна.

Ужо ў студэнцкія гады Юрый Леанідавіч зрабіў заўважныя крокі ў навуковай дзейнасці. Ён з задавальненнем займаўся ў навуковым гуртку, удзельнічаў у студэнцкіх канферэнцыях. Яго працу адзначылі ў ліку найлепшых на рэспубліканскім конкурсе студэнцкіх работ. Вучоба і навуковая праца ўдала спалучаліся з грамадскай дзейнасцю: Ю. Л. Казакоў займаўся камсамольскімі справамі, праявіў сябе як добры арганізатар. Летам 1969 г. ён працаваў у студэнцкім рэстаўрацыйным атрадзе ў Магілёве. Студэнцкі час падарыў шмат цікавых сустрэч і знаёмстваў. Сярод аднакурснікаў Юрыя Леанідавіча былі знакамітыя ў будучым дзяржаўныя дзеячы Н. М. Мазай, П. К. Краўчанка, А. У. Сасноўскі, вядомы гісторык З. В. Шыбека і яшчэ многія таленавітыя і паспяховыя людзі.

У 1972 г. Юрый Леанідавіч выдатна абараніў дыпломную работу па тэме «Барацьба Беларускай ССР у сістэме ААН за ўніверсальнасць членства, падтрыманне міру, раззбраенне і ліквідацыю каланіялізму» і скончыў гістарычны факультэт, атрымаўшы дыплом з адзнакай. Далейшы шлях у навуку пралягаў праз аспірантуру, у якой Ю. Л. Казакоў вучыўся ў 1972–1975 гг. З 1975 г. ён працаваў выкладчыкам, пазней – старшым выкладчыкам, дацэнтам кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў БДУ.

У 1978 г. Ю. Л. Казакоў паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю пад навуковым кіраўніцтвам прафесара М. Я. Шкляра. Праз чатыры гады Юрыю Леанідавічу было прысвоена вучонае званне дацэнта. Поспехам Ю. Л. Казакова спрыяла асяроддзе высокапрафесійных навукоўцаў і выдатных асоб, сярод якіх ён працаваў і набываў жыццёвы вопыт. На фарміраванне навуковага светапогляду маладога выкладчыка аказалі значны ўплыў А. П. Ігнаценка, І. М. Ігнаценка, У. К. Коршук, М. І. Красоўскі, У. М. Сікорскі, І. В. Царук, М. Я. Шкляр.

У 1992 г. у кар'еры Ю. Л. Казакова адбываюцца змены. Ён становіцца дацэнтам кафедры гісторыі Беларусі, а з 1994 г. – кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, якую ўзначальваў на працягу 2006–2016 гг. На кафедры сабраўся калектыў таленавітых выкладчыкаў, апантаных айчыннай гісторыяй даследчыкаў, шчырых сяброў, аднадумцаў: П. А. Лойка, У. П. Емельянчык, Л. А. Жылуновіч, А. Л. Абэцэдарская, У. А. Сосна, В. Ф. Голубеў. Ідзе плённая праца па стварэнні артыкулаў для энцыклапедый, навучальных дапаможнікаў, вучэбных праграм, вылучаюцца новыя падыходы і канцэпцыі ў выкладанні айчыннай гісторыі. Паступова аднаўляецца гераічнае мінулае Вялікага Княства Літоўскага.

За гады працы ва ўніверсітэце Юрый Леанідавіч зарэкамендаваў сябе як высокакваліфікаваны спецыяліст, выдатны арганізатар навучальнага

працэсу і выхаваўчай работы. З 1997 па 2007 г. ён працаваў намеснікам дэкана гістарычнага факультэта БДУ. Займаючы гэту пасаду, Ю. Л. Казакоў з'яўляўся адказным за вучэбна-выхаваўчую работу, кіраваў саветам куратараў факультэта, узначальваў камісію па прафілактыцы правапарушэнняў.

Навуковыя інтарэсы Ю. Л. Казакова ахопліваюць разнастайныя праблемы гісторыі Беларусі XIV–XX стст. Вынікам плённай працы юбіляра стала публікацыя звыш 140 навуковых, навукова-метадычных прац, рэцэнзій на манаграфіі і вучэбных дапаможнікаў. Ён прымаў удзел у падрыхтоўцы дапаможнікаў па гісторыі Беларусі для абітурыентаў[1], навучэнцаў ліцэяў, гімназій і школ[2], а таксама для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі[3]. Юрый Леанідавіч – адзін з аўтараў калектыўных манаграфій і навуковых выданняў[4].

Акрамя таго, Ю. Л. Казакоў кіраваў шэрагам навукова-даследчых работ, такіх як «Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры», «Рэлігійныя працэсы і іх уплыў на становішча беларускага грамадства ў XVI–XVIII стст.», «Еўеўскі буквар 1618 г.: сусветная і гісторыка-культурная спадчына». Апошняя з'яўлялася часткай сумеснага праекта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Бібліятэкі Ганаровага таварыства «Мідл Тэмпл». Вынікам плённай працы даследчыкаў стала факсімільнае выданне «Буквара» 1618 г., які лічыцца дасягненнем айчыннай асветніцкай думкі і вучэбнай практыкі. У межах праекта Ю. Л. Казаковым і А. Р. Дзянісавай было праведзена даследаванне гісторыка-культурных абставін узнікнення ўнікальнага падручніка – першага на тэрыторыі ўсходніх славян буквара[5].

Юрый Леанідавіч плённа супрацоўнічае з калегамі з універсітэтаў Варшавы і Вроцлава. Не толькі прафесійныя, але і сяброўскія адносіны звязалі Ю. Л. Казакова з прафесарам Вроцлаўскага ўніверсітэта Богданам Рокам, вядомым польскім навукоўцам і арганізатарам гістарычнай навукі. Гэта ўзаемадзеянне вылілася ў шэраг праграм і сумесных публікацый[6].

На працягу 1989–2016 гг. Юрый Леанідавіч быў адказным сакратаром часопіса «Веснік БДУ. Серыя 3, Гісторыя. Эканоміка. Права», з 2006 г. па цяперашні час з'яўляецца членам рэдкалегіі зборніка «Працы гістарычнага факультэта БДУ», сакратаром і актыўным удзельнікам савета гістарычнага факультэта БДУ.

Стаж навукова-педагагічнай дзейнасці Ю. Л. Казакова складае амаль 45 гадоў. Такі вопыт не перашкаджае яму пастаянна ўдасканальваць свае прафесійныя ўменні, распрацоўваць новыя цікавыя спецыяльныя курсы для студэнтаў і магістрантаў, авалодваць сучаснымі IT-тэхналогіямі ў навучальным працэсе. Яго заняткі са студэнтамі вылучаюцца навуковай глыбінёй і высокім узроўнем выкладання. Студэнты паважаюць Ю. Л. Казакова як добразычлівага і шчырага выкладчыка.

Юрый Леанідавіч актыўна ўдзельнічае ва ўдасканаленні навучальнага працэсу, у вучэбна-метадычным забеспячэнні выкладаемых дысцыплін. Ён аўтар вучэбных праграм па айчыннай гісторыі для сярэдніх і вышэйшых школ, а таксама спецыяльных курсаў («Рэфармацыя і грамадска-

[1]Гл., напрыклад: Гісторыя Беларусі : вучэб. дапам. / [А. А. Абецадарская і інш. ; пад рэд. А. П. Ігнаценкі, Я. Ю. Несцяровіча]. Мінск : Экаперспектыва, 1994. 206 с. ; Дапаможнік па гісторыі Беларусі для паступаючых у вышэйшыя навучальныя ўстановы / [А. Л. Абецэдарская і інш.] ; пад рэд. А. Г. Каханоўскага [і інш.]. 2-е выд. Мінск : Экаперспектыва, 1997. 314 с. ; Гісторыя Беларусі : дапам. для паступаючых у выш. навуч. установы / [А. Л. Абецэдарская і інш.] ; пад рэд. Ю. Л. Казакова [і інш.]. Мінск : Экаперспектыва, 1998. 494 с. ; Гісторыя Беларусі: праграма і матэрыялы для абітурыентаў / [Беларус. дзярж. ун-т ; склад.: Ю. Л. Казакоў і інш.]. 6-е выд., дап. Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2004. 78 с. ; История Беларуси: полный курс : пособие для старшеклассников и поступающих в вузы / [Ю. Л. Казаков и др.]. Минск : Юнипресс, 2008. 491 с.

[2]Гл., напрыклад: Гісторыя Беларусі : вучэб. дапам. : для ліцэяў, гімназій і школ з паглыбленым вывучэннем гуманіт. дысцыплін / пад рэд. Ю. Л. Казакова і інш. Мінск : Экаперспектыва, 1997. 494 с. ; Всемирная история : учеб. пособие : в 3 ч. Ч. 1–3 / [О. А. Яновский и др.]. 2-е изд., доп. и перераб. Минск : Юнипресс, 2008–2010.

[3]История Беларуси : учеб. пособие для вузов, колледжей, лицеев, гимназий и школ / Белорус. гос. ун-т ; [В. В. Григорьева и др. ; науч. ред. А. Г. Кохановского, О. А. Яновского]. Минск : Беларыт, 1997. 446 с. ; Гісторыя Беларусі : курс лекцый : у 2 ч. / Гродзен. дзярж. ун-т імя Я. Купалы, Беларус. дзярж. ун-т. Ч. 2. XIX–XX стагоддзі / [П. І. Брыгадзін і інш. ; рэдкал.: П. І. Брыгадзін і інш.]. Мінск : РІВШ БДУ, 2002. 655 с. ; Гісторыя Беларусі і сусветная цывілізацыя : дапам. для студэнтаў прыродазн. фак. / [А. Г. Каханоўскі і інш.]. Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2008. 311 с. ; История Беларуси: полный курс : учеб. пособие для студентов неист. спец. вузов / [Ю. Л. Казаков и др.]. Минск : Юнипресс, 2010. 507 с. ; Гісторыя Беларусі : дапам. для студэнтаў устаноў выш. адукацыі, якія навучаюцца па спец. 1-21 03 01 «Гісторыя (па напрамках)» : у 4 ч. / [П. І. Брыгадзін і інш. ; пад рэд. П. І. Брыгадзіна, А. Г. Каханоўскага, С. М. Ходзіна] ; Беларус. дзярж. ун-т. Ч. 1. Ад старажытнасці да сярэдзіны XVI ст. Мінск : БДУ, 2018. 350 с.

[4]Во имя великой цели: мобилизация рабочего класса Белоруссии на решение экономических и социальных задач коммунистического строительства, 1976–1980 / [Г. А. Алдакушин, В. А. Бобков и др. ; редкол.: В. К. Коршук, Р. П. Платонов, Б. И. Загорский и др.]. Минск : Беларусь, 1981. 111 с. ; Имена в истории : кр. биогр. справ. / [авт.-сост.: П. И. Бригадин и др.]. Минск, 1993. 191 с. ; Становление и развитие белорусской государственности / [А. Г. Кохановский и др.]. Минск : БГУ, 2011. 42 с.

[5]*Дзянісава А. Р.*, *Казакоў Ю. Л.* Гісторыка-культурныя абставіны ўзнікнення першага «Буквара» // Першы «Буквар»: да 400-годдзя выдання = Первый «Букварь»: к 400-летию издания = First «Bukvar»: to the 400th anniversary of the publication / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Нац. б-ка Беларусі, М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т ; [склад. А. А. Суша ; пер. на англ. мову Л. Ю. Казакова, А. У. Коршук, В. М. Шумскай]. Мінск, 2018. С. 14–57.

[6]Гл., напрыклад: *Рок Б.*, *Казакоў Ю.* Рэч Паспалітая – краіна многіх народаў // Беларус. гіст. часоп. 2019. № 3. С. 19–24.

палітычная думка Беларусі XVI – першай палова XVII ст.», «Знешняя палітыка Вялікага Княства Літоўскага ў XIV–XVI стст.»). Ю. Л. Казакоў прымаў удзел у распрацоўцы адукацыйных стандартаў для студэнтаў першай і другой ступеней атрымання вышэйшай адукацыі.

Таксама Юрый Леанідавіч прымае актыўны ўдзел у падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Сярод вучняў юбіляра – магістранты, аспіранты, кандыдаты гістарычных навук. Іх дысертацыйныя даследаванні прысвечаны разнастайным аспектам айчыннай гісторыі XI – пачатку XX ст.[7]

За шматгадовую плённую навукова-педагагічную і працоўную дзейнасць па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў Ю. Л. Казакоў узнагароджаны знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь» (2000), ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, БДУ, грамадскіх арганізацый, яму прысвоена званне заслужанага работніка БДУ (2010).

Выключная інтэлігентнасць, добразычлівасць Юрыя Леанідавіча заўсёды выклікалі і выклікаюць павагу да яго з боку выкладчыкаў і студэнтаў. Дэканат, калектывы кафедраў гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, гісторыі Беларусі новага і навейшага часу, сябры і калегі з гістарычнага факультэта жадаюць дацэнту Ю. Л. Казакову моцнага здароўя, далейшага плёну ў навукова-педагагічнай дзейнасці, шчасця.

***А. Р. Дзянісава***[8], ***І. Л. Грыбко***[9]

[7]*Щавлинский Н. Б.* Белорусское национальное движение в годы первой мировой войны (1914–1918 гг.) : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02. Минск, 1999 ; *Мікалаева Л. В.* Арганізацыя знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XV – сярэдзіне XVI ст. : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02. Мінск, 2003 ; *Любы А. У.* Унутрыпалітычная барацьба ў Вялікім Княстве Літоўскім у 30–40-я гг. XV ст. : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02. Мінск, 2006 ; *Дзянісава А. Р.* Праваслаўныя манастыры Турава-Пінскай епархіі ў грамадскім жыцці на беларускіх землях у XI–XVII стст. : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02. Мінск, 2009 ; *Аніпяркоў В. В.* Стварэнне і дзейнасць Таргавіцкай канфедэрацыі на землях Вялікага Княства Літоўскага (май 1792 г. – верасень 1793 г.) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02. Мінск, 2010 ; *Стахно Н. В.* Танаталагічныя ўяўленні шляхты Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XVI – XVIII ст. : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02. Мінск, 2019.

[8]*Елена Григорьевна Денисова* – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры истории Беларуси древнего времени и средних веков исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Алена Рыгораўна Дзянісава* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Alena R. Dzianisava*, PhD (history), docent; associate professor at the department of Belarus history of the ancient time and the Middle Ages, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *dziana@bsu.by*

[9]*Ирина Леонидовна Грибко* – старший преподаватель кафедры истории Беларуси древнего времени и средних веков исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Ірына Леанідаўна Грыбко* – старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Irina L. Hrybko*, senior lecturer at the department of Belarus history of the ancient time and the Middle Ages, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *hrybko@bsu.by*